нального учебного центра, аккредитация программ обучения по специальности «Таможенное дело», в т.ч. планируемой к открытию магистратуры по специальности «Таможенное администрирование», что будет способствовать развитию науки таможенного дела. Отечественная таможенная служба идет по пути сближения в данной сфере и вносит свои предложения во Всемирную таможенную организацию по реализации и внедрению отмеченных позиций. Реализация предлагаемых положений будет способствовать обеспечению соответствия мировым стандартам таможенного регулирования и увеличению эффективности деятельности таможенных органов Республики Беларусь, позволит создать наиболее благоприятные условия для осуществления внешнеэкономической деятельности, использования транзитного потенциала, роста конкурентоспособности экономики.

©ПГУ

# СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ І ТЭНДЭНЦЫІ БУДАЎНІЦТВА КАТАЛІЦКІХ ХРАМАЎ ПАЎНОЧНАЙ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

***М.К. ШАЎЛІС*, У.Я. АЎСЕЙЧЫК**

Unique monuments of archeology, architecture and culturehas preservedin the North of Grodno region of Belarus. They represent the history of the formation of the Belarusian state. In the article the author has considered stylistic features and tendency in the construction of Catholic churches with their characteristic shape due to the rich cultural tradition of the region, based on mutual influence of Byzantine and Roman culture, local climate and level of construction equipment

Ключавыя словы: архітэктура, будаўніцтва, храмы, касцёлы, культавыя пабудовы, гродзеншчына, дойлідства

Шырока вядомая архітэктурная, у тым ліку горадабудаўнічая, спадчына Гродзеншчыны. Тут на берагах Нёмана, як ні ў адной іншай вобласці Беларусі, захавалася значная колькасць аб’ектаў манументальнага дойлідства. Умацаванні Гродна, Ліды, Навагрудка і Крэва разам з іншымі беларускімі, літоўскімі і ўкраінскімі замкамі ўтварылі ў часы ВКЛ цэласную абарончую сістэму агульнадзяржаўнага значэння. Вялікая была яе роля ў абароне ад нападаў рыцараў-крыжакоў. Да перамогі над Тэўтонскім ордэнам у Грунвальдскай бітве 1410 года, крэпасці і замкі Гродзеншчыны з'яўляліся апорнымі пунктамі абароны.

Многія гарады, пасёлкі і вёскі Гродзенскай вобласці захавалі ў сваіх цэнтральных частках архітэктурна-пленіровачныя асаблівасці мінулых стагоддзяў, а таксама дзясяткі твораў архітэктуры і культуры. Многіх з іх, на шчасце, не закранулі горадабудаўнічыя пераўтварэнні апошніх стагоддзяў. Слонім і Навагрудак, Крэва і Гальшаны, Жыровічы і Дзятлава непаўторныя ў сваім абліччы, прывабныя гістарычна-архітэктурнымі ансамблямі, вартымі ўвагі ландшафтамі. Але ёсць гарады, якія вылучаюцца складанай, шматаблічнай прыгажосцю, якая нарадзілася з напластаванняў, пакінутых рознымі эпохамі і мастацкімі стылямі. Такая прыгажосць горада Гродна [1]. Пабудовы розных часоў суседнічаюць на яго вуліцах і плошчах, і гэта не здаецца несумяшчальным, а, наадварот, складае дзіўнае адзінства і прывабнасць.

На поўначы Гродзенскай вобласці Беларусі захаваліся ўнікальныя помнікі археалогіі, архітэктуры і культуры, якія прадстаўляюць гісторыю станаўлення беларускай дзяржавы. Помнікі архітэктуры і гісторыі Гродзеншчыны займаюць значнае месца ў культурнай спадчыне Беларусі. Найбольш вядомыя з іх: касцёлы ў вёсках Міхалішкі, Гервяты, Дайлідкі, Кемелішкі, Гудагай; у вёсцы Варняны – старадаўні архітэктурны ансамбль 18 стагоддзя: Юр’еўскі касцёл (*мал.* 1), дом ксяндза, аптэкара, жылая вясковая архітэктура. У Ашмянскім раёне вылучаецца вёска Баруны, дзе захаваўся цудоўны касцёл; а ў мястэчку Гальшаны захаваліся касцёл, царква і руіны замка роду Сапегаў [2]. На тэрыторыі Смаргонскага раёна ў вёсцы Крэва размешчаны руіны аднаго з самых старажытных сярэднявечных замкаў.

Вынікі работы могуць быць выкарыстаны ў вырашэнні пытанняў і задач па будаўніцтву і рэканструкцыі сакральнай архітэктуры.



*Мал.* 1 – *Юр’еўскі касцёл, в. Варняны*

**Літаратура**

1. *Харэўскі, С.В.* Культавая архітэктура Заходняй Беларусі / *С.В. Харэўскі* // Искусство и культура. – 2012. – № 3(7). –18 с.
2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / гал. рэд. *С.В. Марцэлеў*. – Мінск : Беларуская савецкая энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1986. – 408 с. : іл.